*§ 32-0. Заходняя Беларусь у 1921–1939 гг.

РЫЖСКАЯ МІРНАЯ ДАМОВА
ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ ВАЯВОДСТВА
АСАДНІКІ ПАЛАНІЗАЦЫЯ САНАЦЫЯ
КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ
БЕЛАРУСКАЯ СЯЛЯНСКА-РАБОЧАЯ ГРАМАДА

1. Тэрыторыя, насельніцтва. Паводле ўмоў *Рыжскай мірнай дамовы* да Польшчы адышлі Гродзенская, усходнія раёны Віленскай і заходнія раёны Мінскай губерняў. У афіцыйных польскіх дакументах гэтыя землі называліся «крэсы ўсходнія», г. зн. усходнія ўскраіны Польшчы.

«Крэсы ўсходнія»

Успомніце, калі і паміж кім была заключана Рыжская мірная дамова.

На іх уводзіўся агульны з Польшчай адміністрацыйны падзел. Заходняя Беларусь была падзелена на чатыры ваяводствы: Палескае, Навагрудскае, Віленскае і Беластоцкае. Ваяводствы дзяліліся на паветы і гміны.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Заходняй Беларусі

У 1931 г. на гэтай тэрыторыі жыло звыш 4,6 млн чалавек. Беларусы складалі большасць (каля 70 %), аднак на дзяржаўным узроўні іх лічылі нацыянальнай меншасцю.

2. Аграрна-сыравінны характар эканомікі Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы. Заходняя Беларусь з'яўлялася аграрнай ускраінай Польскай дзяржавы, выкарыстоўвалася як крыніца сыравіны і таннай рабочай сілы, рынак збыту для польскай прамысловасці. У параўнанні з БССР тут выраблялася прамысловай прадукцыі ў 9 разоў менш, хоць тэрыторыя і колькасць насельніцтва

Эканамічнае становішча Заходняй Беларусі

ў Заходняй і Савецкай Беларусі былі прыблізна роўныя. Адзінай галіной прамысловасці, якая атрымала развіццё, была дрэваапрацоўчая. Гэта тлумачылася нястрымнай эксплуатацыяй ляснога багацця Заходняй Беларусі польскімі і замежнымі кампаніямі.

Становішча рабочых

Як вы лічыце, з чым магло быць звязанае павелічэнне беспрацоўя ў 1930-я гг.?

Працоўны дзень складаў 10–12 гадзін на суткі, а заработную плату рабочыя прадпрыемстваў Заходняй Беларусі атрымлівалі ўдвая меншую, чым у цэнтральных раёнах Польшчы. Пастаяннай з'явай зрабілася беспрацоўе, якое значна абвастрылася ў 1930-я гг.

Становішча сялян

Больш за палову ўсёй зямлі краю належала памешчыкам, якія складалі менш за 1 % насельніцтва. Сяляне Заходняй Беларусі, каля 82 % насельніцтва, адчувалі вострую нястачу зямлі. Пры гэтым былыя польскія ваеннаслужачыя атрымлівалі зямлю на тэрыторыі краю на ільготных падставах. Да 1939 г. на тэрыторыі Заходняй Беларусі было расселена да 10 тыс. *асаднікаў*. У той жа час больш за 120 тыс. сялян у пошуках лепшай долі выехалі ў краіны Заходняй Еўропы і Амерыку.

Нацыянальная палітыка

Успомніце, што такое паланізацыя.

3. Нацыянальная і канфесійная палітыка польскіх улад. Пры заключэнні Рыжскай мірнай дамовы Польшча гарантавала нацыянальным меншасцям права на развіццё ўласных мовы і культуры. Аднак у дачыненні да беларусаў улады праводзілі палітыку прымусовай *паланізацыі*.

Закрываліся беларускія школы, гімназіі, культурна-асветныя ўстановы, бібліятэкі і выдавецтвы. Не дазвалялася выкарыстоўваць беларускую мову ў дзяржаўных установах. З 400 беларускіх школ, якія існавалі на тэрыторыі Заходняй Беларусі перад польскай акупацыяй, на 1939 г. не засталося ніводнай. У Віленскім універсітэце доля беларускіх студэнтаў складала 1–2 %. Больш за траціну насельніцтва Заходняй Беларусі заставалася непісьменным.

ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

З Рыжскай мірнай дамовы РСФСР і УССР з Польшчай

Асобы рускай, украінскай і беларускай нацыянальнасцей у Польшчы маюць права ў межах унутранага заканадаўства культываваць сваю родную мову, арганізоўваць і падтрымліваць свае школы, развіваць сваю культуру і ствараць з гэтай мэтай таварыствы і саюзы. Гэтымі ж правамі, у межах унутранага заканадаўства, будуць карыстацца асобы польскай нацыянальнасці, што знаходзяцца ў Расіі, Украіне і Беларусі.


МИРНЫЙ ДОГОВОР
между
РОССИЕЙ и УКРАИНОЙ
с одной стороны
и
ПОЛЬШЕЙ
с другой.

1. *Якія правы беларускаму насельніцтву абавязвалася даць Польшча ў адпаведнасці з умовамі Рыжскай мірнай дамовы?*
2. *Выкарыстоўваючы тэкст параграфа, дакажыце, што палітыка польскага ўрада ў галіне адукацыі і культуры парушала палажэнні Рыжскай мірнай дамовы.*

У органах мясцовага самакіравання засядалі прызначаныя польскімі ўладамі памешчыкі, асаднікі, чыноўнікі польскай нацыянальнасці.

Канфесійная палітыка

У Польшчы праводзілася палітыка рэлігійнай нецярпімасці ў дачыненні да праваслаўнага беларускага насельніцтва; большасць праваслаўных цэркваў, што існавалі ў Заходняй Беларусі, былі пераўтвораныя ў каталіцкія касцёлы.

У 1930-я гг. палітыка польскіх улад, накіраваная на апалячванне насельніцтва Заходняй Беларусі, зрабілася больш аўтарытарная і агрэсіўная. У дачыненні да ўдзельнікаў нацыянальна-вызваленчага руху арганізоўваліся масавыя судовыя і палітычныя працэсы, выносіліся суровыя прысуды, дзейнічалі надзвычайныя ваенна-палявыя суды. У 1934 г. у Бярозе-Картузскай быў створаны адзін з самых жорсткіх у гісторыі XX ст. канцлагер. За 5 гадоў існавання канцлагера праз яго прайшлі 10 тысяч беларусаў, украінцаў, яўрэяў і прадстаўнікоў іншых народаў.

Канцлагер у Бярозе-Картузскай

Прычыны паланізацыі

4. Паланізацыя. У 1920-я гг. быў вельмі прывабным вобраз БССР, «агульнабеларускага дому». У барацьбе з ростам беларускай нацыянальнай самасвядомасці польскія ўлады рабілі асаблівы акцэнт на рэлігію. Афіцыйнай дзяржаўнай рэлігіяй у Польшчы з'яўляўся каталіцызм. У выніку выкарыстоўваўся такі падыход: калі ты паляк — значыць, каталік, а калі каталік — значыць, паляк.

Формы паланізацыі

У наступе на веравызнанне ўжываліся самыя разнастайныя формы. Ухвалялася шлюбаванне палякаў з беларусамі, аднак вянчанне мусіла быць у касцёле, прымалася каталіцкая вера. Дзеці ў выніку рабіліся палякамі і каталікамі. У масавым парадку закрываліся праваслаўныя храмы, адчужаліся землі, што ім належалі, маёмасць, праваслаўныя цэрквы перабудоўваліся ў каталіцкія касцёлы. З 500 праваслаўных цэркваў, што існавалі ў Заходняй Беларусі, больш за 300 былі пераўтвораны ў каталіцкія касцёлы ўжо да сярэдзіны 1920-х гг.

Вынікі паланізацыі

Калі параўнаць вынікі афіцыйных перапісаў насельніцтва за 1921 і 1931 гг., дык згодна з імі за дзесяць гадоў колькасць беларусаў скарацілася амаль на мільён. Розніца шмат у чым была звязаная з тым, што каталікоў запісвалі палякамі. І, хоць у складзе насельніцтва Заходняй Беларусі беларусы па-ранейшаму пераважалі, іх адносная доля ў шэрагу сацыяльных груп была відавочна невялікая. Палякі складалі абсалютную большасць у паліцэйска-адміністрацыйным апараце, сярод чыноўнікаў і інтэлігенцыі.

Пачатак санацыі

5. Санацыя. У сярэдзіне 1920-х гг. польская эканоміка сутыкнулася з сур'ёзнымі праблемамі. Насельніцтва было незадаволенае высокай інфляцыяй і ростам беспрацоўя, а польскія афіцэры — маштабамі карупцыі ў палітыцы. Унутры краіны ішла пастаянная барацьба розных палітычных партый і груповак. У 1925 г. некалькі ўрадаў на працягу кароткага часу змянілі адзін аднаго. Гэтым скары-

стаўся маршал Ю. Пілсудскі; 12 сакавіка 1926 г. адданыя яму вайсковыя часці рушылі на Варшаву. Разам з тым, ажыццявіўшы пераварот, Ю. Пілсудскі не пачаў адразу мяняць палітычную сістэму Польшчы. Першапачаткова ён заняў пасады ваеннага міністра і генеральнага інспектара ўзброеных сіл, зрабіўшыся фактычным кіраўніком Польшчы. Пад лозунгам «санацыі» (аздараўлення) у Польшчы быў распачаты шэраг палітычных і эканамічных пераўтварэнняў.

Усталяванне культу асобы Ю. Пілсудскага

Апелюючы да патрыятызму і да пачуцця гонару за ажыццяўленне векавой мары палякаў — адраджэнне Польшчы і бліскучыя перамогі над яе ворагамі, — друк і радыё, што кантраляваліся рэжымам, ваенізаваныя і грамадскія арганізацыі стваралі культ легіянераў і іх каменданта Ю. Пілсудскага, фарміравалі яго вобраз як правадыра і айца нацыі. Быў сфарміраваны міф і культ Ю. Пілсудскага, які жыве ў свядомасці многіх палякаў нават у нашы дні.

Сацыяльна-эканамічная сфера

У сацыяльна-эканамічнай сферы «санацыя» звязаная з узмацненнем каланізацыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, узмацненнем асадніцтва. Заканчваецца ліквідацыя сэрвітутаў (зямель агульнага карыстання), што перш за ўсё было ўдарам для асноўнай масы сялянства.

Не адмаўлялася «санацыя» і ад характэрных для недэмакратычных рэжымаў метадаў барацьбы з апанентамі. Ужо ў 1926–1927 гг. «невыяўленыя афіцэры» пачалі збіваць да паўсмерці палітычных праціўнікаў; абвінаваціўшы ў падрыўнай дзейнасці і атрыманні фінансавання за мяжы, улады забаранілі дзейнасць Беларускай сялянска-рабочай грамады і Незалежнай сялянскай партыі, а іх лідараў, пазбаўленных паводле рашэння сойму парламенцкага імунітэту, арыштавалі. Была ўведзена папярэдняя цэнзура друку. У 1931 г. афіцыйна былі ўведзеныя ваенна-палявыя суды; ужо ў 1931–1932 гг.

з палітычных матываў былі арыштаваныя дзясяткі тысяч чалавек. На тэрыторыі Заходняй Беларусі было адкрыта 19 турмаў.

Канстытуцыя 1935 г.

У красавіку 1935 г., незадоўга да смерці Ю. Пілсудскага, у Польшчы была прынятая новая Канстытуцыя, у якую ўвайшлі асноўныя прынцыпы «санацыі»: моцная цэнтралізаваная дзяржава з прэзідэнцкай сістэмай праўлення. Армія ўсё больш выходзіла з ценю. Кіраўніцтва Польшчы не вырашыла найважнейшых сацыяльных і эканамічных праблем. Каб зняць накал напругі ў грамадстве, адбываецца пошук знешняга ворага.

Пачатак палітыкі асадніцтва

6. Асадніцтва. Рассяленне ў міжваеннай Польшчы пачалося законам «Аб наданні зямлі салдатам польскай арміі» (снежань 1920 г.). Такім чынам польскае кіраўніцтва разлічвала аблегчыць мабілізацыю моладзі ў польскую армію і наступную каланізацыю зваяваных зямель. Сваю назву каланісты атрымалі ад слова «osada» — паселішча, сядзіба. Дзяржава аказвала перасяленцам дапамогу для ўладкавання іх гаспадарак.

Асаднікаў нельга атаясамліваць з памешчыкамі, бо яны часцяком самі апрацоўвалі свае надзелы. Перасяленцам былі нададзены кавалкі зямлі ў асноўным удоўж савецка-польскай мяжы. Ваенныя асаднікі мелі зброю і былі аб'яднаныя ў саюз, што выконваў паліцэйскія, адміністрацыйныя і антыдыверсійныя функцыі. Ужо напрыканцы 1924 г. у Заходняй Беларусі налічвалася больш за 5000 асаднікаў. Насаджаючы асадніцтва на зваяваных землях Беларусі, польскія ўлады пераследавалі некалькі мэт: зменшыць зямельны голад у цэнтральных ваяводствах Польшчы, змяніць этнічны склад насельніцтва прыгранічных тэрыторый, паланізаваць беларусаў і адмежавацца ад Савецкага Саюза надзейнай сцяной з карэнных палякаў.

Мэты польскага ўрада

Абавязкі асаднікаў

Пасяленец меў атабарыцца на сваім участку цягам года і на працягу трох гадоў асабіста рацыянальна яго апрацоўваць, плаціць камунальныя падаткі, ахоўваць і ўтрымліваць у належным стане за свой кошт меліярацыйную сістэму, размешчаную на яго ўчастку. Калі гэтыя ўмовы не выконваліся, ён траціў свой зямельны надзел. Аднак у рэальнасці такое адбывалася надзвычай рэдка, бо ў задачы асаднікаў уваходзіла не толькі апрацоўка зямлі, але таксама нагляд і кантроль над мясцовым насельніцтвам.

Адносіны асаднікаў з мясцовым насельніцтвам

Адносіны з мясцовым насельніцтвам, як правіла, у асаднікаў складваліся кепска. Незалежна ад асабістых характарыстык асаднікаў мясцовых сялян раздражняў ужо той факт, што ва ўмовах беззямелля і малазямелля зямлю атрымалі чужакі. Апроч таго, шмат хто з каланістаў сам зямлю не апрацоўваў, а здаваў у арэнду. Гэта яшчэ больш узмацняла сацыяльную напружанасць. У праграмах усіх беларускіх партый, што дзейнічалі ў Заходняй Беларусі, утрымліваўся заклік спыніць асадніцтва.

Прычыны нацыянальна-вызваленчага руху

7. Нацыянальна-вызваленчы, сялянскі і рабочы рух. Палітычнае і нацыянальнае бяспраўе беларускага народа зрабілася прычынай нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. Яго асноўнымі сіламі былі палітычна актыўная частка рабочага класа, сялянства і дэмакратычная інтэлігенцыя. На вызваленчую барацьбу ў краі істотна ўплывала нацыянальна-культурнае адраджэнне, якое адбывалася ў Савецкай Беларусі.

Партызанскі рух

У першай палове 1920-х гг. нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі набыў характар узброенай партызанскай барацьбы. Партызаны нападалі на паліцэйскія ўчасткі, палілі памешчыцкія сядзібы і хутары асаднікаў. У заходняй частцы краю (Гродна, Беласток) партызанскія атрады ўзначальвалі беларускія эсэры, на ўсходзе — камуністы.

К. П. Арлоўскі

С. А. Ваўпшасаў

Вядомымі кіраўнікамі партызанскіх атрадаў былі К. П. Арлоўскі, С. А. Ваўпшасаў.

Беларускі пасольскі клуб

Развіццю нацыянальна-вызваленчага руху ў першай палове 1920-х гг. спрыяла ўтварэнне ў польскім сейме *Беларускага пасольскага клуба*. Яго прадстаўнікі выкарыстоўвалі трыбуну сейма і выступалі ў абарону нацыянальна-сацыяльных правоў беларускага народа.

Успомніце, што такое забастоўка.

Забастовачная барацьба рабочых у першай палове 1920-х гг. ахапіла прамысловыя прадпрыемствы.

Утварэнне Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі

Ва ўмовах росту нацыянальна-вызваленчага руху ў **1923 г.** утварылася *Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (КПЗБ)*. Партыя выступала за ажыццяўленне сацыялістычнай рэвалюцыі ў Польшчы, права на самавызначэнне для Заходняй Беларусі, аб'яднанне ўсіх беларускіх зямель у адзіную Беларускую савецкую рэспубліку, ліквідацыю памешчыцкага землеўладання і перадачу зямлі сялянам без выкупу.

Сцяг КПЗБ

Пасля разгрому паліцэйскімі ўладамі паўстанцкай арганізацыі эсэраў КПЗБ узначаліла партызанскі рух.

Б. А. Тарашкевіч

С. А. Рак-Міхайлоўскі



П. П. Валошын

Аднак ва ўмовах спаду рэвалюцыйнага руху ў Польшчы ўзброеная барацьба зрабілася бесперспектыўнай і партызанскі рух быў спынены.

Пад уплывам КПЗБ дэпутаты сейма Б. Тарашкевіч, С. Рак-Міхайлоўскі, П. Валошын у 1925 г. выйшлі з Беларускага пасольскага клуба і стварылі арганізацыю рэвалюцыйна-дэмакратычнага характару — *Беларускую сялянска-рабочую грамаду (БСРГ)*.

Утварэнне Беларускай сялянска-рабочай грамады

Напачатку 1927 г. БСРГ аб'ядноўвала звыш 2 тыс. гурткоў, у якіх налічвалася каля 120 тыс. чалавек. Гэта напалохала польскія ўлады. У сакавіку 1927 г. БСРГ была забаронена, а яе кіроўны актыў аддадзены пад суд.

Пра высокі аўтарытэт КПЗБ сведчыць той факт, што падчас выбараў у польскі сейм у 1928 г. за яе кандыдатаў прагаласавала амаль траціна выбаршчыкаў Заходняй Беларусі. У выніку быў створаны пасольскі клуб «Змаганне», прадстаўнікі якога адстойвалі інтарэсы рабочых і сялян, а таксама нацыянальныя правы беларусаў. Аднак у жніўні 1930 г. польскія ўлады арыштавалі кіраўнікоў клуба.

Пасольскі клуб «Змаганне»

Напачатку 1930-х гг. адметнай рысай рабочага руху быў рост забастовачнай барацьбы. Гэта было

Забастовачны рух

ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

З палітычнай платформы Беларускай сялянска-рабочай грамады

Стоячы на глебе самавызначэння народаў, Грамада лічыць, што ўсе беларускія землі павінны быць сабраныя і аб'яднаныя ў незалежную рэспубліку пад уладаю сялян і рабочых…

Ведучы барацьбу за самавызначэнне народаў, за сялянска-рабочы ўрад, Грамада разам з тым нястомна змагаецца за задавальненне самых пякучых і надзённых патрэб сялян і рабочых — за зямлю без выкупу, за памяншэнне непасільных падаткаў, за ахову рабочых заканадаўчым шляхам, за родную школу, за палітычныя свабоды і інш.

Усе памешчыцкія землі і землі духавенства павінны быць без выкупу адабраны ад паноў-памешчыкаў і духавенства і разам з казённымі ўладаннямі павінны быць падзелены сялянскімі камітэтамі паміж мясцовымі сялянамі і парабкамі бясплатна.

1. *Якой БСРГ бачыла будучыню беларускай дзяржавы? Як яна прапаноўвала вырашыць аграрнае пытанне?*
2. *Параўнайце праграмныя ўстаноўкі БСРГ і КПЗБ. Што ў іх агульнага? Чым яны адрозніваюцца?*

звязана з пагаршэннем эканамічнага становішча беларусаў падчас сусветнага эканамічнага крызісу 1929–1933 гг. Колькасць забастовак вырасла ўтрая. Асабліва ўпартыя былі забастоўкі лесарубаў на лесанарыхтоўках у Белавежскай пушчы, беларускіх тэкстыльшчыкаў. Улетку 1935 г. пачалося паўстанне нарачанскіх рыбакоў, у якім удзельнічала каля 5 тыс. чалавек.

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, чым было выклікана паўстанне. Ці дасягнулі паўстанцы сваіх мэт?

Паўстанне рыбакоў на возеры Нарач. Мастак В. Цвірко. 1957 г.

8. Этнічная асіміляцыя: мэты, шляхі ажыццяўлення. У створанай у 1918 г. Польскай Рэспубліцы этнічныя палякі не складалі пераважнай большасці, і значная частка польскай эліты бачыла ў гэтым пагрозу для польскай дзяржаўнасці. Заходняя Беларусь разглядалася нават не як калонія, а як спрадвечна польскія землі, няхай і ўскраінныя, то-бок «крэсы». Прама парушаючы міжнародныя абавязкі і гарантыі ў дачыненні да правоў нацыянальных меншасцей, польскія ўлады ўзялі курс на ўтаймаванне і апалячванне беларусаў, «паглынанне» іх польскім этнічным элементам.

Перадумовы этнічнай асіміляцыі

Асаблівую ролю ў этнічнай асіміляцыі насельніцтва Заходняй Беларусі адыгрывала адукацыя. Да перадачы Польшчы беларускай тэрыторыі тут працавала 359 беларускіх школ, настаўніцкія семінарыі ў Свіслачы і Барунах, беларускія гімназіі ў Навагрудку, Нясвіжы, Клецку, Радашковічах і Вільні. Але ўжо ў 1919 г. палякі, акупаваўшы шэраг беларускіх раёнаў, закрылі настаўніцкія семінарыі ў Свіслачы і Вільні, вышэйшае пачатковае вучылішча ў Гродне, а таксама большасць беларускіх школ. У выніку ў 1924 г. засталося ўсяго 37 беларускіх школ і 4 гімназіі з абмежаванымі правамі. У адказ на скаргі пра паўсюднае закрыццё беларускіх школ адзін з вышэйшых польскіх чыноўнікаў даводзіў з трыбуны сойма, што «праз дзесяць гадоў у Польшчы нават са свечкай будзе немагчыма знайсці беларусаў». У 1938/1939 вучэбным годзе ў Заходняй Беларусі ўжо не было ніводнай беларускай навучальнай установы.

Паланізацыя сістэмы адукацыі

У той час навучанне ў польскай гімназіі каштавала надзвычай дорага. Селянін (а імі была пераважная большасць беларусаў), каб паслаць свайго сына або дачку ў гімназію, павінен быў прадаць 3 каровы або 300 пудоў жыта. Нават пры вялізным жаданні ён не мог гэтага зрабіць. Вось чаму пісьменная частка беларускага насельніцтва ў Польшчы пераважна мела адукацыю 3–4 класы. Для многіх беларусаў яна

ўвогуле абмяжоўвалася вывучэннем верша «Катэхізіс польскага дзіцяці». Запазычыўшы сістэму адносін і каштоўнасцей з польскіх зямель, «асаднікі» пераследавалі беларусаў за сам факт этнічнай прыналежнасці.

Узмацненне этнічнай асіміляцыі

Пасля прыходу да ўлады Ю. Пілсудскага і ўсталявання рэжыму «санацыі» ў 1926 г. польскія ўлады ўжо адкрыта кінулі свае абавязкі выконваць правы нацыянальных меншасцей у эканоміцы, сацыяльнай сферы, культуры, адукацыі, рэлігіі, выкарыстанні беларускай мовы. Каб «прымусіць беларусаў думаць па-польску», пераслед беларускай культуры набыў крайнія формы. Так, у некаторых мясцовасцях прызнаваліся небяспечнымі для польскай дзяржавы народныя забавы, тэатральныя прадстаўленні, арганізатараў якіх прылічвалі да камуністычных актывістаў.

9. Стан беларускай культуры. Калі ў БССР ідэя нацыянальна-культурнага адраджэння была падтрымана партыйным кіраўніцтвам, дык у Заходняй Беларусі даводзілася змагацца за магчымасць навучаць сваіх дзяцей на роднай мове.

Таварыства Беларускай школы

Супраць паланізацыі выступіла *Таварыства Беларускай школы (ТБШ)*, якое было заснаванае ў 1921 г. Як легальная арганізацыя, ТБШ мела права адкрываць і падтрымліваць народныя школы, настаўніцкія семінарыі, бібліятэкі. У 1920-я гг. ТБШ ператварылася ў самую масавую беларускую арганізацыю, але ў 1937 г. яго дзейнасць была забаронена.

Публіцыстыка

Адметнай з’явай для Заходняй Беларусі было развіццё публіцыстыкі. Свае газеты і часопісы выдавалі БСРГ, клуб «Змаганне», ТБШ, КПЗБ і іншыя арганізацыі. Паэзія дазваляла хутка і эмацыйна рэагаваць на грамадска-палітычныя падзеі.

Літаратура

Заходнебеларуская літаратура развівалася ва ўмовах нацыянальнага прыгнёту. І. Канчэўскі (І. Абдзіраловіч) у сваім філасофскім эсэ «Адвечным шля-

хам» раскрыў драматызм гістарычнага лёсу беларусаў, іх неадольнае імкненне захаваць сваю незалежнасць.

Пісьменнік, крытык, выкладчык Віленскай гімназіі М. Гарэцкі ў 1920 г. напісаў першую «Гісторыю беларускай літаратуры». Кніга прызначалася для шырокага кола чытачоў.

Творчасць паэтаў і пісьменнікаў Заходняй Беларусі (В. Таўлая, П. Пестрака, М. Танка і інш.) адлюстроўвала барацьбу беларускага народа за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне.

У Заходняй Беларусі стваралі свае палотны выдатныя мастакі. Я. Драздовіч адзін з першых сярод еўрапейскіх жывапісцаў стварыў карціны на касмічную тэму. У залаты фонд беларускага жывапісу ўвайшлі карціны П. Сергіевіча і М. Сеўрука.

Жывапіс

Дарогай жыцця.
Мастак П. Сергіевіч.
1934 г.

Жніво.
Мастак М. Сеўрук.
1937 г.

ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



Я. Драздовіч

Язэп Драздовіч — адна з найбольш значных, самабытных і незвычайных постацей беларускай культуры і мастацтва. Ён адзін з першых пачаў ствараць карціны на касмічную тэму, пры гэтым нават на чужых планетах ён выяўляў пейзажы роднай беларускай прыроды.

Доўгі час пра яго жыццё і дзейнасць не было вядома. Імя Я. Драздовіча стала яскравым адкрыццём у Беларусі ў 1984 г. дзякуючы выхаду ў свет кнігі «Вечны вандроўнік» вядомага пісьменніка і вучонага А. С. Ліса.

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, чаму Я. Драздовіча называюць «беларускім Леанарда да Вінчы».

Паводле Рыжскай мірнай дамовы тэрыторыя Заходняй Беларусі адышла да Польшчы. Палітыка паланізацыі, якую праводзілі польскія ўлады, нацыянальнае і палітычнае бяспраўе насельніцтва Заходняй Беларусі паспрыялі развіццю шырокага нацыянальна-вызваленчага руху, асноўнымі сіламі якога былі КПЗБ, БСРГ, ТБШ і іншыя палітычныя і культурныя арганізацыі.

калі ў свеце…

1920 г. — утварэнне Французскай камуністычнай партыі

на тэрыторыі Беларусі…

1923 г. — утварэнне Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Ахарактарызуйце сацыяльна-эканамічнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы. Чаму Заходняя Беларусь лічылася аграрна-сыравінным прыдаткам Польшчы?
2. Дакажыце, што нацыянальная і канфесійная палітыка польскіх улад у Заходняй Беларусі супярэчыла ўмовам Рыжскай мірнай дамовы. Якую мэту мелі польскія ўлады, праводзячы такую палітыку?
3. Якія формы нацыянальна-вызваленчай барацьбы выкарыстоўвала насельніцтва Заходняй Беларусі? Ахарактарызуйце задачы розных палітычных арганізацый у Заходняй Беларусі.
4. Якіх дзеячаў літаратуры і мастацтва Заходняй Беларусі вы ведаеце? Якія былі асноўныя тэмы ў іх творчасці?